

# Міхась Болсун

*Нарадзіўся ў 1942 годзе ў в. Балсуны Чачэрскага раёна. Скончыў факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і аддзяленне журналістыкі Мінскай ВПШ.*

*Працаваў рабочым саўгаса, загадчыкам бібліятэкі, настаўнікам. З 1965 года – на журналісцкай працы. Быў намеснікам рэдактара чачэрскай райгазеты, галоўным рэдактарам буда-кашалёўскай газеты. Доўгі час працаваў у абласным тэлерадыёаб'яднанні.*

*Член Беларускага саюза журналістаў.*

## МАЦІ

Няхай гады цякуць, як рэкі,
Жыцця спакойнай будзе плынь,
Сляза не росіць твае вейкі,
Ў душу не лезе крыўд палын.

Хай радасць ціхая атуліць,
Надзеі зорка не ўпадзе.
Пабудзь, пабудзь са мной, матуля,
Каб быў святлейшым кожны дзень.

## СПЯВАЛА ЦІХА САМАПРАДКА

У вокны прыцемкі глядзелі,
Цішэлі вуліцы сяла...
З-пад пальцаў матчыных кудзеля
Кужэльнай ніткаю цякла.
Спявала ціха самапрадка,
Вяла адвечны свой матыў,
Каб потым ткала самабранку,
Ручнік на покуць для святых
І рэчы розныя для быту
Матулі рупная рука.
Дагэтуль сніцца, не забыта,
Як цэўкі я на ўток сукаў.

Палотнаў доўгія палоскі
Сцялілі ў лузе па вясне
Жанкі-ткачыхі з нашай вёскі,
Каб кужаль быў бялей за снег.
І трубкі гэтае тканіны,
Бы скарб, у куфрах бераглі.
І на пасаг, і на радзіны
Ішоў дар працы і зямлі.
... Цяпер не стукне бёрда ў хаце.
Ручнік сялянскі я бяру –
Дарунак колішні ад маці,
Цяпло душы яе і рук.

* * *

Чым больш жыву,
тым больш люблю
цябе, мой край
чачэрскі,
да болю родную
зямлю,
людзей,
душой не чэрствых.
Маленства даўнія
гады
і сцежкі маладосці
жывуць у памяці
заўжды,
нібы святое штосьці.
Шугаюць
кветценню сады,
бяжыць шнурком
Каўпіта...
І кожны мой
прыезд сюды —
для дум і спраў
падпітак.

## ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ

*У цэнтры вёскі Палессе*
*ўстаноўлены помнік 178-мі землякам,*
*якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.*
*Тут жа пастаўлены і абеліск.*

*(З кнігі «Памяць. Чачэрскі раён»)*

Андронаў... Болсун... Пісарэнка...
Шалюта... Ядранцаў... Хайкоў..,—
Чытаю, гойдаюцца ў зрэнках
Імёны мужных землякоў.
Калонкі літар, бы абоймы,
Патронаў жоўтыя рады...
Пастой хвіліну — смутак пройме,
Успыхнуць вогненна гады,
Калі лісткамі пахаванак
Вяртала іх вайна сюды,
Аратых Хведараў, Іванаў —
Дзядзькоў і хлопцаў маладых.
Заламвалі у сем'ях рукі,
Цяжар аплакваючы страт...
Праз жах баёў, металу грукат
Ішоў і падаў наш салдат.
... Страла бялее абеліска
Ў абдымках елак і бяроз,
Крыніца шэпча штосьці блізка,
У промнях луг і рэчкі плёс.
Ляжаць вакол спакой і ціша,
Смяецца ранак светлы зноў.
Жыццё гісторыю ўсё піша,
Дзе спяць салдаты вечным сном.

## ГІМНАСЦЁРКА

Я прымераў яе
З трапяткім хваляваннем,
Калі ў войска пайшоў,
Каб Радзіме служыць.
І зялёным было
На плацу тое ранне,
Хоць сняжок навакол
Матылямі кружыў.
Прыгадаў, як глядзіць
Бацька шчыра са здымка
Ў гімнасцёрцы такой,
Што насіў у вайну,
З земляком-сябруком
У салдацкіх абдымках,–
Фота ў рамцы разной
Дзед змясціў на сцяну.
Гімнасцёрку пасля
Ў хаце роднай пабачыў,
Калі бацька з вайны
Перамогу прынёс.
Шчасце біла праз край,
Арашалася плачам,
Не саромеўся род
Тады радасных слёз.
Мой хлапечы пагляд
Зорку згледзеў на шапцы,
Гімнасцёркі рукаў,
Што ля латкі зрыжэў,
І не знаў я, малы,
Што было мала шанцаў
Паглядзець на мяне,–
Бой быў цяжкі за Ржэў.
... Разумею цяпер
Я салдат-ветэранаў,
Калі форму сваю
З той вайны берагуць –
Сведку жорсткіх баёў,
Перамог не экранных,–
Калі з крыкам «ура»
У атаку ўстаюць...

## СНЕЖАНЬ

Дол пульхным дыванам укрыты.
Такая свежасць навакол!
Асенні сум зусім забыты,
Гляджу я здзіўлена ў вакно.
Карункі срэбныя завеі
Павесіў снежань на кусты.
Стаяць бярозкі, нібы феі,
Бялее ельнічак густы.
Ільдзінкі падаюць са звонам,
Калі калючы вецер дзьме.
Снягір пры гальштуку чырвоным
Паклоны дзюбай б'е зіме.

## НАВАЛЬНІЦА

Маланка ломанай іголкай
Прашыла тоўшчу цёмных хмар,
І след яе стралою тонкай
Працяў збянтэжаны абшар.
І тут жа гром заляскаў пугай,
Бы ў вёсцы ранішняй пастух.
Прайшоўся вецер лесам, лугам,
Прамень у воблаках патух.
Цыбаты дождж зацокаў звонка
На стужцы шэрае шашы,
Сыпнуў, бы шротам, ён па вокнах,
Са стрэх зайгралі капяжы.
Усё мацней разгон залевы
Пад сполах часты бліскавіц.
Я слаўлю музыку і спевы,
І буйны нораў навальніц!
... Абмыты вуліцы, прасёлкі,
Лаза страсае кроплі ў Сож.
І пад тугой дугой вясёлкі
Паехаў ціха ўдалеч дождж.

## ЗАСТОЛЛЕ

Ячня жоўтымі вачыма
З патэльні просіцца на стол.
Сквірчыць сальцо, прадукт айчынны,
У кварце свеціцца расол.

Сядзяць дзяды – мае вяскоўцы –
За пляшкай таннага віна,
Праз вокны цэдзіць промні сонца,
Цячэ няспешна гамана.

Ўсё абмяркуюць, ўсё ўзважаць:
Як жыць, чаго нам не стае...
І нават самі не заўважаць –
Ачахла ежа на стале.

* * *

Гады маладыя –
Бы квецень у садзе,
У пырсках вясёлка
На ўзмаху вясла...
Гукнуць бы іх зноўку,
Ды нельга прынадзіць,
Далёка, бы рэха,
Мая ўжо вясна.